220-ИО
26.V.64.

№144-Ш
25.5-64г

СЕКРЕТАРЮ ЦК КПБ

<u>Тов. ШАУРО В.Ф.</u>

127

Уважаемый Василий Филимонович!

Обстоятельства заставили меня обратиться к Вам.

После смерти отца, белорусского поэта Андрея Александровича, я обнаружил в его архиве тетрадь со стихами, которые никогда не публиковались. Стихи написаны в период с 1938 по 1946 г.г., когда отец находился в лагере под Норильском, в Красноярском крае.

Я много думал, можно ли эти стихи обнародовать, и пришел к мысли, что их нужно опубликовать, так как они помогут нашей партии в борьбе с последствиями культа личности. Написанные с партийных позиций, эти стихи имеют и воспитательное значение, как яркий пример моральной стойкости и веры в народ и партию поэта-коммуниста, человека.

Несколько месяцев тому назад я предложил эти стихи редакции журнала "Полымя". Предисловие к ним написал белорусский поэт Алесь Звонак. Стихи в журнале не были опубликованы. Я понимаю товарищей из редакции. Ведь поэтические произведения, написанные в таких условиях и на такую тему, еще не публиковались в нашей печати.

Я прошу Вас познакомиться с этими стихотворениями. Они, на мой взгляд, должны быть опубликованы.

Уважающий Вас

21 мая 1964 г.

Р. Александрович

/Р. Александрович/

Мой адрес: гор. Минск, ул. Волгоградская, 15-а,
кв. 42. Александрович Р.А.

# З ЛІТАРАТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

## Неапублікаваныя вершы Андрэя Александровіча

Больш як год мінула са смерці выдатнага паэта-камуніста Андрэя Александровіча.

Ён пакінуў багатую літаратурную спадчыну. Можна толькі падзякаваць Дзяржаўнаму выдавецтву "Беларусь", якое ў канцы мінулага года выдала збор твораў Андрэя Александровіча ў двух тамах. Аднак не ўсё напісанае паэтам увайшло ў гэтае выданне. Многія яго творы згубіліся зусім, многія былі знойдзены пазней, многія патрабавальны да сябе і да сваёй працы паэт лічыў недапрацаванымі і не ўключыў у зборнікі.

Як бачым па датах напісання, гэтыя вершы прыпадаюць на часы самых цяжкіх выпрабаванняў, што напаткалі паэта ў яго жыцці.

Несправядліва асуджаны і сасланы ў далекія і халодныя мясціны, паэт повен глыбокага смутку. Вершы пісаліся таму, што сапраўдны паэт, які звязаў на ўсе жыцце свой лес з жыццем свайго народа, які жыў яго думкамі і марамі, не мог не пісаць. Ен астаецца паэтам-камуністам, і таму праз боль і смутак так выразна прысвечваюць светлыя праменні нязгаснага аптымізму, непахіснай веры ў будучыню:

Забыўшы гора і бяду,
Я веру, што ізноў прыду
У баявую грамаду,
Як верны сын свайго народу.

Андрэй Александровіч дачакаўся таго дня, аб якім так балюча і страсна марыў,хоць чакаць давялося каля двух дзесяткаў гадоў. Смяртэльна хворы, ён вярнуўся ў строй, ён працаваў да апошняй хвіліны свайго жыцця, нібы умкнучыся навярстаць усё тое, што было страчана, недапісана, недатворана не па яго віне. У новых творах паэт з новай сілай прагучала тая чыстая жыццясцвярджальная, аптымістычная нота, якою прасякнута ўся творчасць паэта, усё яго жыццё.

АЛЕСЬ ЗВОНАК.

# КЛЯТВА

Партыя, перад табою,
Перад роднаю зямлёю,
Перад бацькаўскаю хатай,
Я ні ўчым не вінаваты.
 - Не!

А мяне агаварылі,
Злым паклёпам ачарнілі,
Пасадзілі за сто кратаў,
Я ні ў чым не вінаваты
 - Не!

За калючы дрот загналі,
Імя, прозвішча забралі,
Далі нумар трыста пяты,
Я ні ў чым не вінаваты
 - Не!

Але я не страчу веры,
Праўда крыўдзе шыю зверне,
Справядлівасць справіць свята,
Бо ні ў чым не вінават я
 - Не!

1938.

## ТЫ ДАРУЙ МНЕ

Не разбойнік я, не Каін
І не валацуга,
А гібею ў дзікім краі
За палярным кругам.
Лег на грудзі мне пакутай
Тундры край пустынны.
Ты даруй мне цяжкі смутак,
Родная краіна...

1939.

# МІГ ЗАБЫЦЦЯ

У закутку цёмным на нарах,
Дзе судзжана век свой дажыць,
Каб сэрца магло адпачыць
Ад крыўды хаваешся ў марах.

Пра ўсё забываеш, як быццам
Абрыву зусім не было
І не надламана крыло,
І сум у вачах не дыміцца.

Убачыш сябе між сваімі
І ўжо, як вядзецца здаўна,
Вясёлую чарку віна
Застольная песня падыме.

Як подых прысад, па дарогах
Плыве наша песня, звініць.
Як добра, як хораша жыць
Задорам жыцця маладога...

У міг чараўнічае мары
Свабодна і легка ўздыхнеш
І нібы ўжо больш не нясеш
Пакут незаслужанай кары.

1939.

# ХОЧАЦЦА ЖЫЦЬ

Каб ты толькі знаў, запалярны круг,
Радзіма вятроў, мерзлаты, завірух,
Як хочацца жыць мне.
А ў тундры тваёй
З тваім нізкім небам, аблітым смалой,
З тваёй беспрабудна-суровай зімой
Мне цяжка да болі.
Я прагну туды -
Дзе сонца, дзе ў вішнях ірдзеюць сады,
Дзе вырас, у радасці жыў малады
І песні складаў.
А цяпер, нібы ў сне,
Глумленне, туга, не ўпару ў сівізне,
Скажыце, за што пакаралі мяне,
За што ўсе пакуты?
Хачу быць зусім
Свабодным, як песня ў палеце сваім.
Ні ў чым не змяніўся, не стаў я другім,
Як быў, так застаўся.
Люблю, як любіў
Народ, верным сынам якога я быў.
Няўжо горкі лес мой шляхі мне закрыў
І выйсці не маю?
Няўжо толькі знай, -
Трывай, ды с пакорай сілу згінай.
Эх, тундра-няволя, засовы здымай,
Аддай мне свабоду,
Жыцце мне аддай!..

1939.

x x
x

Калі мне дужа цяжка стане,
Душу маю агорне сум, -
Ніхто спагадліва не гляне
У крыніцу змрочных, ціхіх дум.
Ніхто мне ласкавага слова
Не скажа ў гэты горкі час
І не паможа зняць аковы
Тугі і крыўды, і абраз.
І цяжка мне, чаго таіцца!
Ці ўбачу я любімых зноў?
Мо " перастане сэрца біцца
У пустыні цемры і снягоў?
Ліць слёзы, плакаць я не ўмею,
Не апускаю галаву.
У сэрцы з светлаю надзеяй,
У змроку поўначы жыву.

1940.

# Я ПОМНЮ ТОЙ ДЗЕНЬ ...

Я помню той дзень, краю родны, калі
Мяне разлучылі з табою... Як вецер
Насіў і ганяў па дарогах, па свеце
Знянацку сарваўшы бярозавы ліст -
І я быў падхоплены так і навалай
Занесены ў тундру, на мертвыя скалы,
Дзе нельга і думаць ужо аб свабодзе...
Як дождж сярод яснага неба находзіць,
Туга беспрабудная раптам найшла.

Да стомы кайлю, дабываю руду,
Іду, праклінаючы стужу і камень,
Па грудзі ў снягу, спластаваным вятрамі,
Усе далей і далей на Поўнач іду.
На самы край света. І там, дзе адвеку
Яшчэ не ступала нага чалавека,
Туга, як адзін з самых кроўных сяброў,
Нікуды на шаг ад мяне не адходзіць...
Як золата ў скалах паўночных знаходзіць,
Я ў смутку любоў залатую знайшоў.

1940.

# БЛАГАСЛАЎЛЯЮ ДЗЕНЬ І ЧАС

Калі б ступіў на край зямлі,
Дзе я радзіўся, дзе прайшлі
Гады маіх трывог і захапленняў, -
Чало схіліў бы, шапку зняў
І на калені раптам стаў,
Чытаючы малітву Нараджэння.

- Прымі мяне, мой родны край,
З дарог засовы паздымай,
Раскрый вароты ў светлыя прасторы, -
Я на парозе новых дзён.
Забуду ўсё, як цяжкі сон,
І крыж пакут і выклятае гора!..

Як верны сын, як твой паэт
Я, зноў народжаны на свет,
У вочы сонцу глянуў бы адкрыта
І між заблытанных шляхоў
Сваю б дарожаньку знайшоў,
Што зарасла травою-аксамітам.

Хачу жыцце сваё дажыць!
У жылах кроў агнём гудзіць,
Бушуе нерастрачанаю сілай.
Благаслаўляю дзень і час,
Калі я зноў убачу вас,
Прасторы бацькаўшчыны мілай.

1940.

# СЯБРЫ

Сябры збяруцца, успамінаюць
Жыцце на волі, родны край.
Праявы ў думках набягаюць,
Цыгаркі гаснуць няўзначай.

То як прыбой бурлівай хвалі
Узлятае гутарка парой,
То цішыня ў вачах распаліць
Глухі агонь тугі нямой.

На лад ад бацькі пераняты
Хтось песняй пестуе ў душы,
Садок вішневы каля хаты,
Стэпоў праслаўленую шыр.

Як жыць на бацькаўшчыне люба!
Аднак за свой кароткі век
Жыцце тады сваё галубяць,
Калі ў пакуце чалавек...

1940.

## НІКОЛІ НЕ ЗАБУДУ

У пустыні ледзяной
Беспрабуднай ночы
Я сумую па табе,
Зялёны лісточак.

Я сумую па табе,
Зялёнае поле.
Дзе ні буду - не забуду
Васількі ніколі...

1940.

# ДЗМІЦЕ ВЕТРЫ

Дзміце ветры, ганіце за мора
Стынь палярную цемры глухой.
Ой, ці скора яшчэ, ой, ці скора
Ўбачу сонца я над сабой?

Тое сонца, што ў ціхіх азёрах
Мые косы свае раніцой,
Што ў прасторах, як срэбныя зоры,
Пыватворчаю зьяе расой.

Што так ветліва, як матуля
Песціць роднае сэрцу дзіця,
Чалавека ў адчаі прытуліць
І абудзіць любоў да жыцця.

Ой, ці скора яшчэ, ой, ці скора
Ўбачу сонца я над сабой?
Дзміце,ветры, ганіце за мора
Стынь палярную цемры глухой.

1940.

# ЛІСТ ДАЧУШЦЫ КАРЫНЕ

О, каб меў я крыллі птушкі
/Як народ у казках баіць/,
Паляцеў бы, дарагая,
Да цябе, мая дачушка.

Па-над хмарамі, высока
Я падняўся бы, як сокал,
Аб адным бы толькі марыў:
Прамінуць хутчэй абшары.
Тундры дзікай, непрыветнай,
Дзе не знаюць людзі лета;
Дзе стосільным ураганам
Дуюць ветры акіяна;
Дзе пурга штодня шалее
Так, што сэрца ледзянее,
Дзе і сонейка знікае,
Дзе пануюць над снягамі
Беспрабудна месяцамі
Ноч палярная, глухая...

Да цябе, мая Карынка,
Паляцеў бы я з Дудзінкі,
/Дзе душою так хварэю/
Развітаўся б з Енісеем,
Праляцеў бы я стралою
Над сібірскаю тайгою.

Шлях мне чысцілі б ветры,
Ноччу зоркі б ясназзялі.
З песняй я ляцеў бы ўдалеч
Кіламетр за кіламетрам.
Песня сілу б мне давала.
Волю славячы, шчасліва,
Праляцеў бы я імкліва
Па-над скаламі Урала.

Па шляху з нябесных нітак,
Цвета чыстага блакіту,
Як бацькоўскі дар касынку
Я б саткаў цябе, Карынка.
Гальштук выткаў бы чырвоны

З яркіх сонечных праменняў
І сустрэчаю натхнены,
Я ляцеў бы ў летуценнях
Над шумлівымі лясамі,
Над квяцістымі лугамі
І, трывогаю абняты,
Апынуўся б каля хаты
Дзе жывеш, мая Карынка,
Чарнавокая дзяўчынка,
З Радаславам - родным братам,
З мамкай, Беці дарагой,
Беці, любаю маёй...

Ці то раніцай, ці ў вечар,
Я стаяў бы ля парога,
Сэрца білася б трывогай
Надыходзячай сустрэчы.
Вось мы разам!..

Міг кіпучы!
Мы спаткаліся...
................
Даволі.

Эх, Карыначка, балюча
Мне пісаць табе з няволі.
Але будзем, будзем, будзем,
Будзем мы яшчэ як людзі,
Жыць шчаслівa, дружна жыць,
Толькі б мужна пераяыць
Наша гора.

Эх, дачушка,
Сакатушка, весялушка,
Расцвітай, расці на славу,
Слухай мамку,
Любі Славу
І мяне абавязкова
Помні дзетанька...
Канчаю.

Не вясельм, бачыш, словам
я пішу.
Чаму?
Бывае!
Падрасцеш, сама пазнаеш.
Будзь здарова.

1940.

# НОВЫ ГОД

І вось чарговы цяжкі год
Жыццем закрэслены ў расход.
Дарма надзей я сцярог
Пра светлы дзень свабоды.
Дарогай леташняй нягода
Прыходзіць разам з Новым годам.
Зноў той жа подых крыўды і трывог,
Зноў сэрца ў чорных лапах гора,
І сення цемень, як і ўчора,
Туга па роднай старане,
Па другу, дзецям, любых мне
Таіцца ціха ў сівізне,
Што так прыйшла не ўпору...
Забыўшы гора і бяду,
Я веру, што ізноў прыйду
Ў баявую грамаду,
Як верны сын свайго народу,
Шчаслівым вольна зажыву,
І першы дзень сваёй свабоды
Я Новым годам назаву.

1940.

СЕКРЕТАРЮ ЦК КП БЕЛОРУССИИ

товарищу ШАУРО В.Ф.

Я беседовал с сыном поэта А.Александровича. Р.А.Алексaндрович согласился с нашим мнением, что публиковать стихи, которые он обнаружил в архиве отца в настоящее время не следует.

Зав.идеологическим отделом
ЦК КП Белоруссии (А.Кузьмин)

IO.УП.64 г.
сс-2